ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 74 (1041) | НЯДЗЕЛЯ, 30-га сакавіка 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 30 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сакратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ Х.

Кошт асобнага №—2 кап.

НА БАЯВЫЯ ТЭМПЫ

Неадкладна выправіць опортуністычныя памылкі

ЦК ЛКСМБ заслухаў даклады трох акруговых камітэтаў комсамолу аб удзеле апошніх у вясеньняй сельска-гаспадарчай кампаніі і папярэдзіў усю комсамольскую організацыю ў наяўнасьці небясьпекі спаўзаньня асобных зьвеньняў комсамолу ў опортуністычнае балота.

На прыкладах гэтых акруг ЦК ЛКСМБ паказаў усёй комсамольскай організацыі конкрэтныя правы правага ўхілу ў правядзеньні работы па вясеньняй сельска-гаспадарчай кампаніі.

Асноўнымі політычнымі памылкамі ў кіраўніцтве гэтых акруговых камітэтаў выявіліся: **яўная недаацэнка і амаль адсутнасьць практычнай работы сярод батрацтва і беднаты, слабы, а месцамі зусім недастатковы ўдзел комсамолу у ліквідацыі кулацтва як клясы, наяўнасьць штампоўшчыны і дзяляцкага падыходу пры вырашэньні задач сельска-гаспадарчай кампаніі.**

ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове прама гаворыць, што **„тэмп, размах і практычная работа ЛКСМБ па ўдзелу ў вясеньняй сельска-гаспадарчай кампаніі не адпавядае баявым задачам партыі, якія ўскладзены на комсамол“.**

Гэтае становішча ставіць перад комсамолам Беларусі задачу хутчэйшага выпраўленьня меўшых месца прарываў, хутчэйшага выкананьня тых задач, якія пастаўлены партыяй перад комсамолам.

Аднак, замест таго, каб адразу мобілізаваць масы на выкананьне пастаноў ЦК КП(б)Б і ЦК ЛКСМБ, частка акруговых камітэтаў падышла па дзяляцку, абмежаваўшыся рассылкамі цыркуляраў у раёны.

Больш таго, **Магілеўскі АК ЛКСМБ** правіў яўна опортуністычную лінію па выкананьню пастаноў ЦК ЛКСМБ аб удзеле ў вясеньняй сельска-гаспадарчай кампаніі, заявіўшы, што **„пастанова ЦК ЛКСМБ па дакладу Бабруйску, Воршы і Магілеву іх не датычыцца“.**

Такія опортуністычныя размовы не атрымалі належнага адпору з боку ўсяго бюро АК ЛКСМБ. І толькі пад націскам прадстаўніка ЦК УсеЛКСМ бюро АК прымушана было запісаць пункт аб тым, **што яно сваімі паводзінамі об'ектыўна недаацэньвала рашэньняў ЦК ЛКСМБ.**

Наяўнасьць опортуністычных памылак у рабоце гэтых акруг, яўнае выступленьне супроць лініі партыі Шклоўскага, Рагачэўскага і іншых РК КП(б)Б, слабасьць работы па растлумачэньню лініі партыі аб колгасным руху, яўная недаацэнка пастаноў ЦК ЛКСМБ з боку Магілеўскага АК сьведчыць нам аб тым, што паасобныя зьвеньні кіраўніцтва ЛКСМБ заражана опортунізмам.

Прыклад Магілеўскага АК сыгналізуе перад намі небясьпеку, што частка кіраўніцтва **б'ючы сябе ў грудзі прызнае свае памылкі і ў той-жа час палец аб палец ня стукне для таго, каб у практычнай рабоце іх выпраўляць.**

Сыгнал Магілеву зьяўляецца папярэджаньнем і для астатніх акруг, як штампоўшчына, няўменьне мобілізаваць масы, «галаваакружэньне ад посьпехаў» (нас гэта не датычыцца—мы акруга суцэльнай колектывізацыі) сьведчыць аб тым, што ў комсамоле ёсьць дзе-ні-дзе і ў кіраўніцтве тыпы прышыбеевых, тыпы опортуністых, якія маскуюць свой твар штампованай рэзолюцыяй, цыркулярам.

Лічаныя дні і гадзіны засталіся да выхаду ў поле. Задача комсамолу зараз заключаецца у тым, каб своечасова пераключыцца ўсёй сваёй масай на работу непасрэдна па выкананьню плянаў сельска-гаспадарчай кампаніі

Галоўнае ў рабоце комсамолу заключаецца ў тым, каб узяць баявыя тэмпы работы, каб поўнасьцю перавесьці ўсю работу на рэйкі ўдарніцтва, каб упарта, штодзённа мобілізаваць масы на выкананьне пастаноў партыі і саюзу, каб поўнасьцю забясьпечыць далейшае разгортваньне колектывізацыі і ліквідацыі кулацтва, як клясы.

Гэта можна зрабіць толькі пры ўмове мобілізацыі мас батрацтва і беднаты ў саюзе з серадняком пад кіраўніцтвам партыі.

Комсамольская організацыя ні на хвіліну не павінна паслабляць увагі і барацьбы да праў опортунізму і „левай“ фразы.

Патрэбна шляхам шырокага разгортваньня бальшавіцкай самакрытыкі выкрываць опортуністых і „левых“ фразёраў, якія сваімі дзеяньнямі зрываюць правядзеньне лініі партыі. **Ня голыя фразы аб прызнаньні памылак, а сапраўдная работа па іх выпраўленьню, ня штамп, а мобілізацыя шырокіх мас павінны легчы ў аснову ўсёй работы.**

Комсамолія Магілеўшчыны і комсамол усёй Беларусі павінны мобілізаваць усе свае сілы на зьнішчэньне опортуністычных прарываў, якія мелі месца ў кіраўніцтве некаторых акруг і ў паасобных зьвеньнях організацыі.

ПАСТАНОВА БЮРО ЦК КП(б)Б

ад 26 сакавіка 1930 году

аб опортуністычных рашэньнях Шклоўскага РК КП(б)Б

Бюро ЦК КП(б)Б, заслухаўшы даклад сакратара Магілеўскага АК КП(б)Б тав. Найладна аб рашэньнях бюро Шклоўскага РК КП(б)Б у сувязі з пастановай ЦК УсеКП(б) „Аб барацьбе з скрыўленьнямі партлініі ў калгасным руху“ і артыкулам тав. Сталіна „Головокружение от успехов“, канстатуе, што гэтыя рашэньні Шклоўскага РК, яўна опортуністычныя, зьяўляюцца пратэстам супроць лініі партыі на выпраўленьне скрыўленьняў партыйнай лініі ў калгасным будаўніцтве, гэтыя рашэньні азначаюць сапраціўленьне Шклоўскага РК КП(б)Б правядзеньню ў жыцьцё пастановы ЦК УсеКП(б) („Правда“ 15-3).

Бюро ЦК пастанаўляе:

1. Распусьціць Шклоўскі Райком КП(б)Б, склікаць не пазьней 5-га красавіка ўнечарговую раённую партыйную конфэрэнцыю для выбараў новага райкому. Даручыць Магілёўскаму АК КП(б)Б у адносінах да членаў Райкома, сапраціўляючыхся правядзеньню ў жыцьцё лініі партыі, прымяніць суровыя меры партыйнага спагнаньня.

2. Сябра Магілёўскага АК КП(б)Б, Рэдактара газэты „Камунар Магілёўшчыны“ тав. Перахода, які знаходзіўся ў Шклоўскім раёне на працы па калектывізацыі і правядзеньні веснавой сяўбы, ведаў аб гэтых рашэньнях Шклоўскага райкому і ні сам на месцы, ні праз Акругком, ні праз газэту ня прыняў належных мер дзеля адмены гэтых пастаноў — зьняць з працы рэдактара газэты і вывесьці з складу Акругкома.

Кандыдата Магілёўскага АК КП(б)Б тав. Зельдовіча, якому было даручана Акругкомам правесьці сход партактыву ў Шклове з мэтай мабілізацыі партарганізацыі на выкананьне пастановы ЦК УсеПК(б) „Аб барацьбе з скрыўленьнямі партыйнай лініі ў калгасным будаўніцтве“ так правёў актыў, што апошні фактычна далучыўся да опортуністычнай пастановы Шклоўскага РК,—вывесьці з складу Бюро Магілёўскага Акругкому. Паведаміць аб гэтым паліт. кіраўніцтва Беларускае Вайсковае Акругі.

3. Бюро ЦК адзначае, што Бюро Магілёўскага АК КП(б)Б не прыдало належнага палітычнага значэньня опортуністычным рашэньням Бюро Шклоўскага Райкому, ну па позна рэагавала за гэтыя зьявішчы, што паставіць на від Бюро Магілеўскага АК КП(б)Б.

Даручыць Магілеўскаму АК КП(б)Б тэрмінова праверыць прапрацоўку ва ўсіх ячэйках партыйнай арганізацыі пастановы ЦК УсеКП(б) аб барацьбе з скрыўленьнямі партлініі ў калгасных будаўніцтве, мабілізаваўшы ўсю партыйную арганізацыю на правядзеньне ў жыцьцё гэтай пастановы.

Бюро ЦК КП(б)Б даручае Магілеўскаму Акругкому тэрмінова расьледваць абураючыя выпадкі затрыманьня і захаваньня газэт з артыкулам т. Сталіна „Головокружение от успехов“ і далажыць Бюро ЦК аб выніках расьледваньня.

Пахаваньне ахвяр 6-га сакавіка ў Бэрліне



Пахаваньне ахвяр паліцэйскіх растрэлаў у дзень барацьбы з беспрацоўем адбыліся 17 сакавіка пры вялікім удзеле бэрлінскіх рабочых. Паліцыя конфіскавала трупы і тайком перавезла іх на могілкі, каб зрабіць немагчымай жалобную працэсію.

Тым ня менш шмат тысяч рабочых прынялі ўдзел у пахавальнай працэсіі, якая суправаждала дэкарыраваны чырвоным пусты катафалак. Паліцыя разагнала дэманстрантаў, але яны зьбіраліся ізноў і ізноў. Паліцыя пусьціла ў ход гумовыя дубінкі, і, нарэшце, арыштавала катафалк. На могілках адбылася магутная жалобная дэманстрацыя. На чале прышоўшай на могілкі магутнай працэсіі ішлі т. т. **Тэльман і Нэйман.**

З прамовамі выступілі ад імя компартыі тав. Тэльман, а ад імя МОПР'у тав. Гешке.

Пасьля пахаваньняў ва ўсходняй частцы Бэрліну мелі месца сутычкі паміж рабочымі і паліцыяй. Сутычкі працягваліся да позьняга вечару.

На здымку: дэмонстрацыя рабочых у шматтысяч. чалавек аддае апошні доўг загінуўшым барацьбітам у дзень 6-га сакавіка.

НАД КІТАЕМ РАЗЬВІВАЕЦЦА СЬЦЯГ РЭВОЛЮЦЫІ

У шэрагу провінцый устаноўлена савецкая ўлада

Салдаты пераходзяць у чырвоныя атрады

ШАНХАЙ, 28. Карэспондэнт ангельскай газэты „Івнінг Прэс“ паведамляе: „З кожным днём становіцца больш відавочным, што Цьзюцьзяну (у паўночнай частцы провінцыі Цзянсі) абкружан тэрыторыямі, **на якіх комуністыя захапілі поўнасьцю ўладу.**

Гарады Шуйчан і Хукоў (на захад і ўсход ад Цзюцьзяну) таксама падпарадкаваюцца пагрозе захопу. У Шуйчане магазыны зачынены. Салдаты і паліцыя з цяжкасьцю утрымліваюць горад, баючыся высьці за яго межы. З прычыны таго, што некаторыя станцыі заняты комуністымі лінія Цзюцьзян—Нанчан працуе нерэгулярна.

Карэспондэнт адзначае, што клясавая барацьба ў вёсцы прымае жорсткія формы. **Сяляне забіваюць земляўласьнікаў і джэнтры** (дробныя земляўласьнікі). Салдаты ловяць сялян і адсякаюць ім галовы. Ніхто ня можа заставацца нэйтральным. **Салдаты ахвотна масамі пераходзяць у чырвоныя атрады.** Сялянская моладзь далучаецца да комуністых так як пасылаемыя ўрадам салдаты пад прадлогам вышукаў чырвоных, рабуюць і тэрарызуюць сялянства. Усё гэта падрывае давер'е да ўраду і ўзмацняе ўплыў комуністых. На поўдні провінцыі Цзянсі таксама опэрыруюць моцныя комуністычныя атрады.

Рэволюцыйныя пролетарскія атрады пад кіраўніцтвам компартыі гэроічна змагаюцца за сваё вызваленьне

ШАНХАЙ, 28. З усіх канцоў поўдню працягваюць паступаць паведамленьні аб сялянскім руху, які прымае ў шэрагу месц нябачныя памеры. Газэты прымушаны прызнаць, што рэволюцыйныя атрады займаюць вельмі ўстойлівыя позіцыі ў провінцыях Гуандунь, Цзянсі і Хуцьзянь.

Сёньняшнія паведамленьні гавораць аб тым, што рэволюцыйныя атрады занялі Чжэдан на паўднёвы Усход ад Гуандуня, а таксама Шансун у тэй-жа провінцыі. Сувязь з раёнамі перарвана. Мяркуюць, што там утворан савецкі ўрад. Супроць рэволюцыйных атрадаў высланы ўрадавыя войскі. Каля 2000 добраузброеных чырвонаармейцаў пайшлі ў раён Тунгджэн каля Ханкоў. Супроць іх таксама высланы войскі. У Нантуні комуністычныя атрады абязброілі паліцыю, захапілі муніцыпальныя ўстановы і распаўсюдзілі сваю ўладу на ўвесь раён.

Француcкія аэропляны абстрэльваюць савецкую тэрыторыю

ШАНХАЙ, 28. Некаторыя газэты падцьвярджаючы факт абстрэлу савецкай тэрыторыі Гуансі, каля Індыкітаю француцкімі аэроплянамі, зазначаюць, што адзін аэропляк разам з лётнікамі быў захоплены кітайскай Чырвонай арміяй у палон, пасьля таго, як быў прымушан зьнізіцца.

Бомбы і дубінкі супроць зьняволеных

НЬЮ-ЁРК, 28. 750 зьняволеных, якія знаходзяцца ў гарадзкой турме Джэфферсон-Сіці (штаце Місуры) узбунтаваліся, выступаючы супроць надзвычайна цяжкай работы і дрэнага харчаваньня. Турэмная варта для ўсьмірэньня бунта карыстаецца сьлезатачывымі бомбамі і дубінкамі.

Процэс „СВУ“

Падсудны Гермайзе „раскайваецца“ і „асуджае“ сваю дзейнасьць

ХАРКАЎ, 29. 27 сакавіка вярхоўны суд па справе СВУ скончыў допыт падсуднага Гермайзе.

Гермайзе ізноў імкнецца прадставіць сваю контррэвалюцыйную работу ў иляі... фа... х. Ён заўляне, што часта нават шкадаваў аб тым, што ў Акадэміі няма камфрацыі, якая магла-б ажыцьцявіць пролетарскі кантроль. Яўна контррэвалюцыйныя „маладыя акадэміі“ Гермайзе называе амаль што не савецкай організацыяй, якая аднак, працавала... консьпіратыўна.

Падсудны лічыць сябе вінаватым, толькі ў тым, што об'ектыўна садзейнічаў контр-рэволюцыі і як член СВУ меў уплыў на моладзь не ў савецкім напрамку.

Імкнучыся выгарадзіць сябе Гермайзе заяўляе, што ўжо з 24 году ў яго пачаліся разыходжаньні з Яфрэмавым. Ён нават парваў з ім навуковую сувязь і паслаў яму рэзкі ліст. Аднак, калі запыталі аб гэтым Яфрэмава, апошні адказаў, што ён ніякага разыходжаньня не прыкмячаў і ніякага лісту ад Гермайзе не атрымоўваў.

У канцы допыту Гермайзе заяўляе, што ён асуджае „дзейнасьць“ сваёй позіцыі,

Генэральны агляд падрыхтаванасьці да сяўбы

БЮРОКРАТЫЗМ, ЭНЭРТНАСЬЦЬ І НЕПАВАРОТЛІВАСЬЦЬ

шэрагу менскіх акруговых устаноў—вясеньняй сяўбе ў акрузе рыхтуюць правал

Ударыць па тых, хто тармозіць баявой рабоце

Мобілізаваць шырокія рабочыя, батрацкія і бядняцка-серадняцкія масы на бальшавіцкае правядзеньне сяўбы

Падрыхтоўка да вясеньняй пасеўнай кампаніі па Менскай акрузе праходзіць слаба.

Вынікі абсьледваньня кіруючых менскіх акруговых устаноў брыгадамі акруговай РСІ паказваюць, што акруга яшчэ не падрыхтавана да сяўбы.

У акрузе ня ведаюць колькі колгасаў перайшло на новы статут

Па акрузе існуе 638 колгасаў. Адной з найважнейшых задач зьяўляецца зараз перавод гэтых колгасаў на новы статут. Новы статут у раёны пасланы толькі дзён пяць таму назад. Аб тым, як ідзе пераход на новы статут і лік перанедзеных ужо колгасаў, акруговыя ўстановы, Акрза і колгассаюз ня ведаюць. Растлумачальнай работы сярод колгасьнікаў яшчэ і зараз не вядзецца з-за гэтага ёсьць шэраг непаразуменьняў, якія дэмобілізуюць падрыхтоўку колгасаў да сяўбы.

Па акрузе амаль у кожным раёне мелі месца перагібы. У раёнах былі выпадкі голага адміністраваньня пры правядзеньні работы па колектывізацыі і раскулачваньні, былі перагібы і ў адносінах да серадняцтва.

Факты кажуць, што раскулачваньне праходзіла на некаторых раёнах і тады, калі ніякай работы па колектывізацыі не праводзілася, а сродкі ад раскулачаных гаспадарак пападалі ці паасобным колгасьнікам, ці трымаліся ў камітэтах узаемадапамогі.

І толькі 9-га сакавіка па лініі Акрза дадзены конкрэтныя прапановы на раёны, як павінна скарыстоўвацца кулацкая маемасьць, ня гледзячы на тое, што ў гэтым напрамку і па лініі раскулачваньня і організацыі колгасаў Менскім АК КП(б)Б своечасова дадзены конкрэтныя паказаньні.

Зараз яшчэ ў акрузе ня ведаюць, як раёны выпраўляюць дапушчаныя перагібы, што імі робіцца для поўнага правядзеньня дырэктыў партыі па колгаснаму будаўніцтву і севу, у гэтым напрамку не наладжана дастатковае інфармаваньне акругі.

Дзе-ж работа з батрацтвам і беднатой?

Батрацка-бядняцкая маса і серадняк і ў паасобных раёнах поўнасьцю яшчэ не мобілізаваны навакол выкананьня задач сяўбы і колектывізацыі. У большасьці колгасаў яшчэ зараз ня створаны батрацка-бядняцкія групы (Астрашыцкі Гарадок, Пухавічы). Акрза і колгассаюз яшчэ і зараз не пераключылі поўнасьцю сваёй увагі на справу арганізацыі працы сярод беднаты і батрацтва ў колгасах.

Зусім дрэнна абстаіць справа з уцягненьнем батрацтва ў колгасы. Напрыклад, акрколгассаюз і Акрза ня ведаюць на колькі ахоплена батрацтва колгасамі.

У некаторых мясцох батракі, якія ўступілі ў колгасы—і зараз ня маюць ніякіх матар'яльных сродкаў існаваньня, не атрымоўваючы дапамогі з колгасаў.

Толькі нядаўна асыгнавана на гэта 70000 рублёў для крэдытаваньня батрацтва, але рэалізацыя гэтых крэдытаў яшчэ і цяпер неорганізавана.

Да гэтага часу ня зроблена па колгасах амаль нічога, каб замацаваць організаваныя колгасы, не растлумачаны апошнія дырэктывы партыі, не адсейваюць чужы элемэнт, які падрывае колгас знутры.

Ня ўсе колгасы аформлены. Земляўпарадкаваны колгасы толькі на 60 процантаў.

У адносінах земляўпарадкаваньня маюць месца факты, калі пад колгасы адводзілася ўся плошча, вёскі, дзе сялянства ўступіла ў колгас толькі на 50-60 проц. Толькі зараз па раёнах пачынаюць выпраўляць гэтыя памылкі.

Забясьпечым сяўбу ўсімі сродкамі

У процэсе работы па абагуленьні жывёлы па акрузе мелі месца моманты, калі нават абагулялі курэй, прапускаючы міма ўвагі найважнейшыя мерапрыемствы гаспадарчага замацаваньня колгасаў.

Зараз абагулена коняй на 42 проц., каровы абагулены на 33 проц. і сьвіньні на 39 проц. Абагуленьне сьвіней таксама сьцьвярджае аб перагібах, якія мелі месца. Дакладнай-жа ўстаноўкі па лініі Акрза колгассаюзу няма. яны супакоіліся на тым, што па лініі акруговму партыі былі пасланы партыйным камітэтам суровыя паказаньні аб выпраўленьні перагібаў.

Пры абагуленьні насеньня зусім мала зьвернута ўвагі абагуленьню траў і бульбы: травы абагулены на 52.7 проц., бульба на 56.2 проц., зерневыя-ж культуры абагулены на 81 3 проц.

Да гэтага часу не прынята ніякіх мер да пераброскі лішкаў насеньня ў тыя раёны, дзе яго будзе недахоп пры сяўбе. Гэта тлумачыцца і тым, што раёны ня ведаюць колькі і якога насеньня трэба для абсеменяньня плошчы.

Асабліва дрэнна абстаіць справа з бульбай. Бульба раскулачаных гаспадарак трымаецца ў дрэнным стане, а тая, што знаходзіцца ў колгасьнікаў, без вучоту. Акрза і колгассаюз ня турбуюцца. Яны супакоіліся на тым, што ў іх ёсьць 300 тысяч пудоў бульбы ад загатовак.

Чарапашым тэмпам...

Зусім слаба ідзе загатоўка траў. Напрыклад, па загатоўках вікі, выканана заданьне толькі 20.6 проц., цімафееўкі—6.6 проц., лубіну—48 пр.

З завозам сартавога аўса праз абмен работа амаль не організавана. Заданьне СНК у гэтым напрамку выканана толькі на 16 пр. Па лініі КСУ плянавае заданьне падрыхтоўкі фондаў выканана толькі на 60 пр.

Завоз угнаеньня не адпавядае плянавым меркаваньням. Плян выканан толькі на 37 проц. Горш абстаіць справа з загатоўкай вапны. Плян выканан толькі на 26.4 проц. Маючыяся па акрузе 10 вапняных млыноў толькі нядаўна распачалі працу, але працуюць яны са значнымі перабоямі. Некаторыя млыны загружаны перапрацаванымі матар'яламі, якіх не адпраўляюць у колгасы; дзякуючы неорганізаванасьці гэтай работы.

На загатоўку яшчыкаў для попелу затрачана 20000 р. Попелу сабрана мала. Збор попелу ня выкупіць затрат на яшчыкі. Жылсаюз не паклапаціўся аб тым, каб належна організаваць работу па збору попелу.

Па акрузе ў цэлым зараз ужо наглядаецца недахоп у фуражы, раёны робяць заяўкі (Барысаў, Бягомль) акруговыя установы у гэтым напрамку нічога не зрабілі, не клапаціліся для таго, каб мець поўныя зьвесткі забясьпечанасьці раёнаў фуражом.

Плянаваньне работы з севам патрабуе тэрміновай праверкі забесьпячэньня колгасаў харчамі. Усё гэта павінна зараз-жа прайсьці па лініі акруговых устаноў своечасова забясьпечваючы месцы па іх заяўках.

Раёны бязьдзейнічаюць

Па многіх раёнах зернаачыстка ня скончана. Некаторыя машыны яшчэ і цяпер няпоўнасьцю нагружаны, і равяраючы надзякавана, відаць што некаторыя раёны спынілі гэтую работу (Бягомль, Самахвалавічы, Гарадзкая чарта). Акруговыя ўстановы гэта прапускаюць міма вушэй.

Нічога ня зроблена па праверцы якасьці насеньня. Дырэктывы ў гэтым напрамку па лініі ўстаноў былі, але іх ніхто не правярае.

АКРЗА і НКЗ спрачаюцца, а організацыя станцыі ні... з месца

Рамонт інвэнтару і другіх машын па акрузе праходзіць слаба. Існуе 188 кузьняў і майстэрняў, якімі адрамантавана 5298 розных машын. Акруговыя ўстановы абмежаваўшыся лічбаю кузьняў не паклапаціліся тэрмінова праверыць наколькі гэтыя кузьні апраўдаюць задачы рамонту інвэнтару. як організавана ў іх работа, ці забясьпечаны яны жалезам? А між тым гэта галіна работы праваліваецца.

Машынатрактарных станцый у акрузе будзе організавана адна ў Койданаве. Але ў гэтым напрамку яшчэ нічога ня зроблена.

Машына-конных станцый у акрузе па пляну трэба організаваць 55, організавана з іх 43. Гэтая лічба не адпавядае сапраўднасьці, бо некаторыя станцыі існуюць толькі на паперы. Нават пытаньне аб організацыі машына-конных станцый не распрацавана. Устаноўка АКРЗА-станцыя не асобная організацыя, а ў межах і ў складзе буйных колгасаў—разыходзіцца з устаноўкай НКЗБ. Гэта неўвязка патрабуе тэрміновага ўрэгулёваньня, бо значна тармозіць організацыю станцыі.

Завоз машын з акругі ў раёны не організаваны.

Трактарныя абавязацельствы толькі на паперы

Па Менскай акрузе згодна заданьня АКРЗА трэба сабраць 600 тысяч руб. Сабрана ж зараз толькі 98.063 руб.

Частка раёнаў ў гэтым напрамку бязьдзейнічаюць. Напрыклад Калыльскі раён сабраў 130 руб., Плешчаніцкі 556 руб. і Лагойскі 700 рублёў, што значна не адпавядае плянавым меркаваньням і сьцьвярджае аб злачынным абыходжаньні раёнамі гэтай важнейшай справы.

Ізноў спрэчкі

У сыстэме кантрактацыі ёсьць між АКРЗА і Гандлёвым аддзелам неўвязка. Кантрактацыя праходзіць слаба. Заключана дагавароў толькі на 33,1 проц. Сталых-жа вядлў у акруговых установах аб ходзе контрактацыі ня маецца. Ды сама сыстэма кантрактацыі выклікае некаторыя супярэчнасьці, бо з боку Гандлёвага Аддзелу ўзяты напрамак тавары, а АКРЗА стаіць за вытворчы. У АКРЗА па гэтаму пытаньню шмат гавораць, а справы не ўзгадняюць між установамі і кантрактацыя стаіць на месцы

Засыпаюць...

Колгасьнікі „[illegible]“ (Койданаўскі раён) падрыхтоўваюць сельска-гаспадарчыя машыны да сяўбы.

„Ды мы-ж і раней клапаціліся“

Організацыі пасеву, поўнаму ахвату тых гаспадарак, якія засталіся па-за колгасам, увесь час надаецца вялікая ўвага для таго, каб уся плошча была засеяна. Па Менскай акрузе толькі ў апошні час распачалі работу па правядзеньню п сеўных плянаў у жыцьцё, забясьпечваючы абслугоўваньне індывідуальнага сэктару, па правядзеньню аграмінімуму да асобных гаспадарак і г. д. На сёньняшні дзень тут ёсьць небясьпека ў тым, што дзякуючы неорганізаванасьці з боку мясцовых устаноў некаторая плошча ня будзе засеяна. Задача ахвату засевам усёй плошчы патрабуе ўжыць тэрміновыя меры.

Пачаліся палявыя работы ў колгасе імя Дзяржынскага

НА ЗДЫМКУ: Падрыхтоўка глебы да засыпкі насеньня у колгасе імя Дзяржынскага (Гомель)

331 колгас без рабочых плянаў

Складаньне рабочых вытворчых плянаў, якія-б забясьпечвалі правільную расстаноўку зьяўляецца важнейшай задачай у рабоце калгасаў. Аднак, па акрузе ёсьць такія раёны, дзе няма зусім рабочых плянаў. На 122 колгасы Бягомльскага і Барысаўскага раёну няма ніводнага пляну. Часта бывае, што складзеныя пляны недобраякасны, не ахватваюць усе галіны работы ў колгасах, а між тым, з боку акрза, Колгассаюзу няма пэўных установак і ўніфіцыраванага разьліку па складаньню пляну.

Генэральны агляд падрыхтоўкі сяўбы не организаваны

Колгасы і саўгасы яшчэ не ахоплены соцспаборніцтвам і ўдарніцтвам. Акруговыя організацыі ў гэтым напрамку ніякай работы не праводзяць.

Колгасы і саўгасы не правяралі сваю падрыхтоўку да сяўбы. Акрза толькі 27 сакавіка дало дырэктывы на месцы аб правядзеньні генэральнага агляду, ня гледзячы на тое, што гэта трэба было зрабіць значна раней.

Падрыхтоўка кадраў для колгаснага будаўніцтва набывае надзвычайна вялікае значэньне, але ў Колгассаюзе гэта не заняло належнай увагі. Надзвычайна дрэнна абстаіць справа з рахункаводамі, якіх падрыхтавана толькі 8 чалавек, у той час калі іх патрэбна ня менш як 310 чалавек.

Акрза, Колгассаюз і Наркамасьветы недастаткова пераключылі сваю ўвагу на гэты вучастак работы.

Сярод аграномаў ёсьць 40 проц., якія самастойна праводзіць работу па колгасным будаўніцтве ня могуць, а патрабуюць штодзённага нагляду і кіраўніцтва, што значна адбіваецца на ўсёй рабоце па дачы правільных паказаньняў, як у стварэньні плянаў, так і ў практычнай організацыі работы.

Па акрузе працуе 789 чалавек рабочых, мобілізаваных з прадпрыемстваў. Толькі днямі наладжана плянавае іх скарыстаньне на практычнай рабоце ў калгасах, а да гэтага часу людзі на раёнах амаль нічога не рабілі.

Усё яшчэ... ўзгадняюць

Правяраючы дзейнасьць і работу акруговых устаноў, наколькі яны пераключыліся і надышлі шчыльна да сяўбы, трэба констатаваць, што акруговыя ўстановы поўнасьцю не мобілізавалі сваю ўвагу на правядзеньне сяўбы.

Да апошняга часу яшчэ спрачаюцца, узгадняюць, адпісваюцца бюрократычнымі паперамі, а справай падрыхтоўкі да сяўбы слаба займаюцца.

Комсамольскія організацыі павінны зараз-жа больш мобілізаваць сябе на гэты вучастак работы па забесьпячэньню сяўбы. Усе організацыі партыйныя, профсаюзныя і грамадзкія кіруючыя ўстановы павінны пераключыцца на баявыя тэмпы работы. Між тым, АК ЛКСМБ не мобілізаваў як належыць масы на вырашэньне гэтых задач.

Я. Крыніца

„Гігант“ гатовы

У саўгасе „Гігант“ пачалася сяўба. У гэтым годзе „Гігант“ засявае плошчу ў 74.500 га. Уся пасеўная плошча разьбіта на 12 вучасткаў, на чале якіх стаяць загадчыкі. Для пасьпяховасьці палявых работ організаваны 24 пункты, на якія зьвезена насеньне, прычапныя машыны, продукты харчаваньня і апал для трактараў. Рабочая сіла „Гігант“ забясьпечан. 694 чалавекі прапушчаны праз спэцыяльныя агранамічныя курсы.

НА ЗДЫМКУ: урачысты выезд на вучасткі для правядзеньня сяўбы.

Барацьба за прамфінплян—барацьба за пяцігодку!

Завод імя Ланцуцкага—кандыдат на чорную дошку—ЁН ГАНЕБНА НЯ ВЫКАНАЎ ПРАМФІНПЛЯНУ

Рабочая моладзь заводаў „Пролетары" і імя Ланцуцкага—ПА-БАЛЬШАВІЦКУ ЗМАГАЙЦЕСЯ ЗА ВЫКАНАНЬНЕ І ЗАМАЦОУВАНЬНЕ ДАСЯГНЕНЬНЯЎ ПА ПРАМФІНПЛЯНУ!

Завод „Пролетары" працуе з вялізарнымі стратамі

Стыхія безгаопадарнасьці пагражае захлынуць якасныя паказальнікі


Арматурны цэх ганебна адстае

Выканаць і перавыканаць прамфінплян! Пад гэтым лёзунгам працуюць зараз заводы і фабрыкі Саюзу. Завод „Пролетары" (Гомель) таксама змагаецца за выкананьне і перавыкананьне прамфінплану.

ЗАВОД ВЫКАНАЎ ПРАГРАМУ ЗА ЛЮТЫ МЕСЯЦ НА 103,2 ПРОЦАНТЫ. Але ня гледзячы на тое, што агульны паказальнік даволі ўцяшальны, нам усё-ж неабходна константаваць, што рабочы колектыў, роўна як і яго трохкутнік НЕДАСТАТКОВА ЭНЭРГІЧНА ЗМАГАЕЦЦА ЗА ВЫКАНАНЬНЕ ПРАМФІНПЛЯНУ. Чым-жа іншым, як нежаданьнем прылажыць энэргію, магчыма назваць тое, што ў арматурным цэху выканалі програму на люты месяц толькі на 67,4 проц., як назваць тое зьявішча, што брак перапынак на сьнеданьне шмат каго не задавальняе і яны да працы прыступаюць пазьней чым гэта патрэбна. Прычын для адказу шмат: засядзеўся на нарадзе, сходзе, не пасьпеў закончыць сваёй гутаркі ў сталоўцы, захапіўся гульнёй на піяніно, затрымаўся ў завкоме і г. д.

У час працы любяць „паганяць саву", падыскусыраваць. Чысьціць варштаты пачынаюць раней, чым гэта патрэбна. Мыюць рукі замест вады олеанафтай і г. д.

Заводакіраўніцтва і адміністрацыя ніякіх захадаў ня прымаюць да таго, каб прарывы гэтыя зьнішчыць. Тут-жа неабходна падкрэсьліць, што ў гэтым цэху, як і ў іншых, ёсьць ударныя брыгады, ёсьць **комсамольская ячэйка, якая ня цікавіцца ўдарным рухам у сваім цэху.**



На заводзе ёсьць шмат адкідаў жалеза розных сартоў. Заводакіраўніцтва адпраўляе усё гэта ў Рудметальгандаль, а на заўтра-ж гэтыя адкіды зноў купляе.

даходзіць у чыгунна-ліцейным да 7,5 проц., медна-ліцейным—19 проц? А працдысцыпліна, а барацьба са стратамі, а моманты безгаспадарнасьці на заводзе? Але ня будзем пералічваць, пачнем папарадку:

Арматурны цэх плянецца ў хвасьце

Арматурны цэх плянецца ў хвасьце па выкананьню прамфінпляну: выканаў яго толькі на 67,4 проц. Сабекошт у першым квартале цэх зьнізіў толькі на 5,5 проц. замест 19 проц. па заданьню. У цэху за студзень і люты былі вялікія страты па цэлым шэрагу прычын. Тут мы маем павялічэньне браку, прастояў, і пераплаты па звышзьдзельных расцэнках. Так напрыклад, брак даў страту ў суме 1608 рублёў, пераплата па звышзьдзельных расцэнках даходзіць да 9118 руб., прастоі абышліся ў 542 руб. 60 к. Такім чынам страты завод мае 11268 руб. Пагражаюча хутка растуць прастоі. Па цэху за адзін толькі студзень месяц налічваецца 419 гадзін прастою. Гэтыя лічбы перавышаюць у 4 разы колькасьць прастояў па ўсяму заводу. Тут-жа неабходна падкрэсьліць, што выкананьне прамфінпляну цэхам залежыць шмат ад інструмэнтальнай. А інструмэнтальная—вузкае месца цэху. „Лёгкая кавалерыя" зацікавілася гэтым пытаньнем і выявіла, што ў працы інструмэнтальнай няма плянавасьці.

ЗА АПОШНІ ЧАС КАЗІРАЮЦЦА ЧАСТЫЯ РАМОНТЫ ВАРШТАТАЎ, У ВЫНІКУ ЧАГО ВЕЛЬМІ ЧАСТЫ ПРАСТОІ.

Зношанасьць варштатаў і іх частак ня ўлічваецца. Дрэнна скарыстоўваюцца сьлесары рамонтнай брыгады; адзін і той-жа варштат рамантуецца па некалькі раз, агляду зробленага рамонту ня бывае. Часткі ад станкоў раскіданы, часам прыходзіцца шукаць іх цэлымі гадзінамі. Усё гэта—вынік нядбайных адносін да сваіх абавязкаў з боку мэханіка цэху т. Нікалаева.

„... Любяць паганяць саву"...

З працдысцыплінай ня лепш. У цэху штодзённа заўважваюцца такія хваробныя зьявішчы, як напрыклад, за 5-10 хвілін да званка на сьнеданьне некаторыя рабочыя ўжо пакідаюць варштаты і чакаюць званка ля выхаду. Гадзінны

Комсамольская ячэйка за ўвесь час існаваньня ўдарнай брыгады ў цэху ні разу не зацікавілася яе працай.

У медна-ліцейным ня лепш

Ня лепш абстаіць справа ў медна-ліцейным цэху. Тут якасьць ліцьця надзвычайна нездавальняючая: неаднамернасьць фігур, перакосы, неаднароднасьць сплаву і інш. Вось, што гавораць аб гэтым факты:

Завод „Пролетары" прыступіў да вырабу новага вузору вадзяных вінцеляў—гекантэль. Першапачатковы працэс выкананьня заказу—адліўка вінцеляў утвараецца медна-ліцейным цэхам, а потым ужо выкананьне астатніх працэсаў пераходзіць у арматурны цэх.

Трэба было чакаць, што майстар медна-ліцейнага цэху, раней чым прыступіць да масавага ліцьця, выпрабуе першыя некалькі штук, але ён гэтага не зрабіў і завод дорага за гэта паплаціўся. Пасьля апрацоўкі вышэйпаказаных фігур на такарных і фрэзэрных варштатах прыступілі да зборкі, але да зборкі парашылі зрабіць выпрабаваньне на ціск. І што-ж аказалася?—Арматурнаму цэху прышлося абвясьціць конкурс на лепшага чорнарабочага, які-б справіўся насіць брак у вагранку.

Толькі з аднаго акту відаць, што з 422 штук карпусоў гэкентэль 220 штук аказалася забракаванымі. Гэта акрамя браку, які атрымаўся пры апрацоўцы на варштатах.

Майстар медналіцейнага цэху ў пагоні за колькасным выкананьнем работы (тонны) зусім пазабыўся на якасьць яе.

19 кастрычніка завод прыняў заказ на выраб двух катлоў гідраўлічнага ціску для фабрыкі „Чырвоны Кастрычнік". Заказ вельмі тэрміновы і да выкананьня яго прыступілі зараз-жа. Але па недагляду не зрабілі ў катлох аднаго кальца, на выраб якога патрэбна страціць максымум гадзіну. З-за гэтай дробязі заказ яшчэ ня зроблены і па гэты час, а фабрыка „Чырвоны Кастрычнік" пакуль нясе страты.

А як абстаіць справа в начной зьменай?

Што выкрыў „налёт?"...

Рэдколегія заводзкай газэты „Чырвоная Вагранка" зрабіла налёт на начную зьмену, і вось што выявілася:

Начная зьмена разглядаецца, як нешта другараднае ў заводзкім організьме. Майстроў на працягу ўсяе зьмены ў цэху ня бывае. Прыходзяць на некаторы час і ізноў уходзяць. У чыгуначна-ліцейным і кавальскім цэхах іх зусім ня бывае. **У выніку слабога кантролю, назіраньня і кіраўніцтва ў начной зьмене больш усяго прастояў, парушэньня працдысцыпліны, беспарадку ў выдачы інструмантаў, браку і г. д.**

Налёт выкрыў вялізарную лічбу (ва ўмовах заводу) варштатаў—„прагульшчыкаў", лічбу, якая замаскавана ў ранішняй зьмене, бо днём усе варштаты нагружаны і працуюць.

На халастым шківе 33 варштаты

Як толькі „налётчыкі" накіраваліся ў цэхі, ім адразу-ж кінуліся ў вочы „асірацелыя варштаты". Падлічваюць:—у такарным цэху „гуляюць" 14 варштатаў, у арматурным—19. Гэта акрамя тых, якія знаходзяцца ў рамонце. Маторы працуюць ня спыняючыся ні на хвіліну, не зьмяншаючы хуткасьці ходу трансмісій, і ўсе гэта на халастым ходу.

У пусты гук пераўтвараюцца размовы, пастановы, мерапрыемствы аб 100 проц. выкананьні вытворчай программы. І ўсё гэта пры наяўнасьці заказаў, матар'ялаў і інш. майстры спасылаюцца на адсутнасьць рабсілы. Але трэба-ж пакласьці канец бесшабашнаму абяскроўліванню такарнага варштату. У арматурным цэху значная частка варштатаў „гуляе" вечарам таму, што частка рабочых—рабфакаўцы і тэхнікумаўцы—пераведзены ў дзённую зьмену. **Трэба прыняць якія-небудзь захады, варштаты не павінны стаяць. 33 варштаты павінны запрацаваць. Інакш прарыў немінучы.**

Няма калібраў

Токар БУДНІК точыць падшыпнікі; дзірка — 50 міліметраў. У Шустэра, які працуе ў другім канцы цэху, шасьцяронкі таксама расточваюцца ў 50 міліметраў. І аднаму і другому патрэбен калібр. І вось пачынаецца: Шустэру трэба браць апошнюю стружку—ідзе да Будніка і чакае да таго часу, пакуль у таго калібр аслабаніцца. Працуе... Пачынае другую шасьцярню. У гэты час у Будніка апошняя стружка, цяпер ужо яго чарга дачакацца калібру. Падобныя факты—частыя зьявішчы ў цэху. Токары аб гэтым неаднакраць гаварылі адміністрацыі, але дагэтуль ніякіх вынікаў.

Інструмантальная ў час працы гадзінамі бывае на замку. Інструмантальшчыкі ідуць каліць „зорачкі", а ў гэты час рабочыя чакаюць іх, каб атрымаць інструманты, **а праца чакае іх усіх разам узятых.**

Разец не бярэ

Да рэчы кажучы, у агульны стогн зьліваюцца скаргі такароў на цьвёрдасьць чыгуна:—проста разец не бярэ, штохвілінна садзіцца, паставіш і ўзноў затачваць патрэбна". Аб тым, наколькі гэта б'е па сабекошту—можна судзіць па наступных фактах:

Грабенчатых шківоў на варштаце тав. Шусгава і Грыцюка раней выраблялася 4-5 штук за зьмену, а цяпер ня больш двух. Колаў да раствору мешалак замест 14-15 штук за зьмену, а цяпер ледзьледзь можна выпусьціць 7-8 штук. Некаторыя рэчы зусім не паддаюцца апрацоўцы.

Вырабаў выпускаецца роўна ў два разы менш з-за дрэннай якасьці чыгуна. Чаму-ж пагаршаецца якасьць чыгуна? Нядаўна „лёгкая кавалерыя" зрабіла „налёт" на чыгунна-ліцейны цэх. Працуюць у цэху дзьве зьмены, прычым, заліўка робіцца на вячэрняй зьмене. Што-ж выкрылася? **Заліўку робяць чорнарабочыя, якімі ніхто ня кіруе, бо майстар цэху, як правіла, па вечарох адсутнічае.**

Асноўныя прычыны, выклікаючыя такія прарывы, упіраюцца ў слабое і няўмелае кіраўніцтва працаю з боку цэхавай адміністрацыі і заводакіраўніцтва, у адсутнасьць няўвязкі між цэхамі, падзеньне працдысцыпліны, у недагружанасьць варштатаў.

Выжыць гэтыя прычыны неабходна зараз-жа, інакш завод можа стаць перад фактам невыкананьня гадавога заданьня. **А выканаць гэтае заданьне нават з перавышэньнем завод „Пролетары" можа і павінен.**

Рыгор Праўдзівы.

Завод, які цягнецца ў хвасьце

На заводзе імя Ланцуцкага надзвычайна пашыраны выпадкі рвацтва. Рвачы прыходзяць на вытворчасьць, адбываюць свае 8 гадзін, а да астатняга ім ніякай справы няма, яны цікавяцца толькі грашыма.

На двор выкацілі некалькі незакончаных вагонаў, жалезам яны яшчэ не абіты і не афарбаваны, дождж падае ў адтуліны і ў выніку мы атрымоўваем, што некаторыя вагоны яшчэ да выпуску з рамонту прыходзіцца яшчэ раз рэмантаваць. Хто ў гэтым вінаваты?

Бязумоўна, адміністрацыя, якая не зьвяртае на гэту справу належнай увагі.

А вось вам яшчэ факты. Галоўны склад—гэта база, якая забясьпечвае матар'ялам ня толькі наш завод, але і ўсю лінію. Гэты галоўны склад знаходзіцца якраз на тэрыторыі заводу імя Ланцуцкага. Здаецца, што мы павінны раней усіх ведаць, што патрэбна нам і што ёсьць на гэтым складзе. А ў нас наадварот, калі на галоўным складзе ёсьць матар'ял, дык такі, які нам непатрэбен і вельмі часта прыходзіцца зьвяртацца да прыватніка, плацячы яму ў некалькі разоў даражэй устаноўленай цаны.

Часта рабочыя гавораць, што цэнтральная інструмэнтальня заводу ня мае добрага інструманту і той інструмант, які маецца не апраўдвае свайго прызначэньня. Паўстае пытаньне—куды дзеўся інструмант, які быў раней? А вось дзе ён. Многія рабочыя, карыстаючыся выпадкам, што інструмантальшчыкі дзякуючы сваёй блізарукасьці ня ставілі клеймо майстэрняў на інструмантах, прыносілі з дому нікуды няварты сапсаваны інструмант і выменялі ў інструмантальні на добры. Шмат якія рабочыя аб гэтым ведалі, але нічога не гаварылі.

Адміністрацыя заводу парашыла зрабіць некаторыя рацыяналізатарскія мерапрыемствы, каб зьнізіць сабекошт і пачала праводзіць фотохронамэтраж, каб устанавіць пэўныя расцэнкі, па якіх яны павінны будуць плаціць рабочым зарплату. У выніку гэтага фотохронамэтражу рабочыя зараблялі раней 50-60 проц. звыш сваёй стаўкі, а зараз і тарыфнай стаўкі не зарабляюць. Тлумачыцца гэта тым, што нормІровачнае бюро, якое працуе пры вагонным цэху, няўважліва адносіцца да сваёй працы.

Новую сыстэму аплаты магчыма толькі выкарыстаць да конвеернага спосабу, дзе кожны рабочы будзе працаваць адпаведна сваёй кваліфікацыі, а вось гэтага галоўнага нормІровачнае бюро ня ўлічвае.

Наш завод ужо даўно ўступіў у соцспаборніцтва, але акрамя голых плякатаў нічога нідзе няма. Брыгадзір ударнай брыгады ня ведае якая розьніца паміж звычайнай арцельлю і ўдарнай брыгадай. Работа даецца несвоечасова. Калі майстра пытаюць—хто ў гэтым вінаваты, дык ён кажа, што вінавата агульнае правіла. Якое гэта правіла—ніхто ня ведае.

На 500 чалавек рабочых маецца больш 20 манцёраў, ды ў тры-чатыры разы больш брыгадзіраў. А працы няма ніякай. Патрэбна зрабіць рацыяналізацыю адміністрацыйнага апарату, бо ён вельмі вялікі.

Што-ж робіць партколектыў на заводзе Ланцуцкага? Ён ня толькі нічога ня робіць, але-ж ня хоча рабіць. На адным з сходаў сэкратар партколектыву тав. Клябанаў заявіў: „Якая нам справа да таго, колькі рабочы зарабляе, наша справа выканаць прамфінплян". Ці так ставіць пытаньне партыя. Мне здаецца, што не. Пасьпяховае выкананьне промфінплану ні ў якім разе не павінна адбівацца на экономічным становішчы рабочых.

Завод імя Ланцуцкага стаіць перад пагрозай апынуцца на чорнай дошцы. Комсамольскаму колектыву разам з партыйным і ўсімі грамадзкімі організацыямі неабходна разгарнуць працу на пасьпяховае выкананьне прамфінпляну і выпраўленьне маючыхся на заводзе прарываў.

Васіль Рандо.



Піраміда шкоднікаў



— Эх, сумна чагосьці! Урачыстае абяцаньне даць, ці што? Альбо —вытворчую клятву...

— Немагчыма, Іван Пятровіч, уся дошка абяцаньнямі ўжо запоўнена.

У опортуністычным балоце

Полацкая акруговая інспэкцыя працы яўна сказіла клясавую лінію—патакала кулацкай эксплёатацыі батракоў

„Чырвоная Полаччына“ не хацела „компромэнтаваць“ адказных працаўнікоў

ПОЛАЦКАЯ АКРУГОВАЯ ІНСПЭКЦЫЯ ПРАЦЫ У СВАЁЙ ПРАКТЫЧНАЙ ПРАЦЫ ЯЎНА СКАЖАЛА КЛЯСАВУЮ ЛІНІЮ. ПРАВЫ ОПОРТУНІЗМ, ЯК МЫ УБАЧЫМ НІЖЭЙ, ХАРАКТЭРНЫ ДЛЯ ЎСЁЙ ПРАКТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЬЦІ ІНСПЭКЦЫІ. ЗАМЕСТ ЖОРСТКІХ МЕР ДА КУЛАЦТВА ЗА ЭКСПЛЁАТАЦЫЮ БАТРАКОЎ ІНСПЭКЦЫЯ ПРАЦЫ ПАТАКАЛА КУЛАКАМ.

Так, напрыклад, Берзін Іван з Краснаборскага сельсавету (Расонскі раён), які мае 5 кароў, 3 кані, 20 гэктараў зямлі, індывідуальна абкладзены, систэматычна на працягу году эксплёатаваў батрака, не заключыў нават з ім дагавору і за гэта быў аштрафаваны толькі на 3 р. Другі кулак Каркалецкага сельсавету (Дрысенскі раён) Янкевіч Ульлян, які мае 49 гэктараў зямлі, 5 кароў, 2 кані, 2 жарабят, 3 цялят, за няуноску страхплацяжоў за батрака, ня дачу батраку на працягу 9 месяцаў выхадных дзён пастановай інспэктара працы Гвазьдзёва быў аштрафаваны толькі на 15 р. Кулак Прышывалка Міхась з Заскарскага сельсавету (Ветрыншчына) не заключаў умовы за батрака, эксплёатаваў яго, не даваў выхадных дзён і не аплачваў іх, не даваў батраку вопраткі тым жа Гвазьдзёвым быў аштрафаваны на 10 р. Прышывалка мае 4 каровы, 2 цялят, 2 кані, 1 жарабя.

Гандляр м. Клясьціцы (Расонскі раён) Альбін Арон за эксплёатацыю хатняй працаўніцы быў аштрафаваны толькі на 5 р. Кулак Нікіпараў Іван таго-ж раёну за эксплёатацыю батрака аштрафаваны на 3 р. Кулак, індывідуальна абкладзены з Паповалуцкага сельсавету таго самага раёну Казуліта Яхім трымаў на працягу году батрака, не заключаючы дагавору з ім—быў аштрафаваны на 3 р. Кулак Пашненка Зьмітрок з Гомельскага с.-савету (Ветрынскі р.), мае 5 кароў, 18 гэктараў зямлі, 2 коней, 1 цёлку, трымаў 3 батракоў, не заключаючы на іх умовы і не плаціў страхузносаў. Батракі эксплёатаваліся. Райупаўнаважаны працы наклаў штрафу 100 р., а акруговая інспэкцыя працы наменшыла да 60 руб. Другі кулак той-жа мясцовасьці Хвасьценка Пётра, які мае 7 кароў, 29 гэктараў зямлі, 3 кані падатку плаціць 276 руб., не аплачваў батраку згодна дагавору за звыштэрміновую працу, не плаціў страхузносаў; таксама райупаўнаважаным працы быў аштрафаваны на 100 руб., а як дайшла справа да акруговай інспэкцыі працы, штраф быў паменшаны да 60 рублёў. Гр. Бялевіч Я. В. маючы 16 гэктараў зямлі, 3 каровы, 1 каня і іншую маемасьць, за ня выплату пэнсыі батраку і за ўжываньне звыштэрміновай працы быў аштрафаны на 5 рублёў.

Інспэкцыя працы мела іншы „клясавы падыход“ да савецкіх устаноў і серадлякоў, так, напрыклад, на старшыню Селяўшчынскага крэдытнага т-ва Тарасэвіча накладзен штраф у суме 10 р. за тое, што апошні спазьніўся на некалькі дзён паведаміць аб колькасьці працаўнікоў у таварыстве. Гр. Эрдман Панкрат з Замшанскага сельсавету (Баркавіцкі раён), які мае серадняцкую гаспадарку (2 каровы і 1 конь) быў аштрафаваны на 15 р. за несваечасовую ўплату страхузносаў.

Маецца цэлая сэрыя падобных прыкладаў спаўзаньня з клясавых пазыцый, але і гэта даволі, каб давесьці тое, што полацкія працаўнікі з інспэкцыі працы сваёй яўна праваапартуністычнай лініяй дапамаглі клясава-варожым элемэнтам. Аб скажэньнях клясавай лініі ў інспэкцыі працы Полацкай АКК КП(б)Б, а таксама і акругкому КП(б)Б было вядома яшчэ ў чэрвені месяцы мінулага году, калі падаваўся матар'ял аб гэтым у час чысткі апарату інспэкцыі працы. Але немаведама чаму гэты матар'ял быў прызнаны бязгрунтоўным, а рэдакцыя акруговай газэты „Чырвоная Полаччына“ вуснамі намесьніка рэдактара тав. Лебедзева заявіла: „гэтага матар'ялу наша газэта ня друкуе, бо ў ім ідзе справа аб адказных акруговых працаўніках і мы іх кампромэнтаваць ня можам“.

Мы упэўнены, што ЦКК КП(б)Б высьветліць, чаму Полацкая АКК не палічыла патрэбным рэагаваць на яўна - праваапартуністычную лінію у рабоце інспэкцыі працы, і чаму газэта „Чырвоная Полаччына“ якая ня раз пісала аб самакрытыцы ня гледзячы на асобы, таксама не палічыла патрэбным „скомпромэтаваць“ правых опортуністых,—а гэта нельга інакш кваліфікаваць, як прымірэнчыя адносіны да правага ўхілу.

Сьнежаньскі.

З фота-апаратам па Менску

Група работніц фабрыкі Меншвей, уступіўшых у партыю

Цкуюць моладзь

Спыніць наступ на комсамольцаў на вытворчасьці!

У момант сканчэньня трамвайнага будаўніцтва адміністрацыя аўтатрамвайнага кіраўніцтва для тэхнічнага надзору за працай трамваю запрасіла ў горад Менск тэхнічнага кантралёра Абакумава.

Сваю працу ён пачаў з таго, што паставіў адміністрацыі рэзкія ўмовы.

Калі комсамольцы пачалі выступаць на агульных рабочых сходах і выкрывалі яго клясавы твар, тады ён пачаў з-пад цішка весьці наступленьне на комсамольцаў.

Выражаецца яно ў тым, што напрыклад: адчыніліся першыя курсы вагонаважатых, комсамольская ячэйка выдзьвінула на гэтыя курсы дзяўчыну комсамолку Стрэле.

Тэхнічны кантралёр Абакумаў даведаўшыся, што Стрэле комсамолка пачаўісьці супроць яе, матывіруючы тым, што дзяўчына ня можа быць вагонаважатым, асабіста тады, калі „ёй няма 20 гадоў“.

Рабчынскі сэкратар комсамольскай ячэйкі ў час выпаўненьня абавязкаў кантралёра гаварыў з дзяўчынай. Тэхнічны кантралёр убачыўшы гэты факт напісаў рапарт дырэктару, што Рабчынскі ў час працы гуляе з дзяўчынай.

Факты наступленьня па комсамольцаў і жаданьне іх выжыць з прадпрыемства паўтараюцца вельмі часта.

Комсамольскай ячэйцы і належным органам неабходна прыняць належныя захады, каб спыніць прасьледваньне камсамольцаў.

І. Я. Гел.

Аб чым хочаце, але не аб вучобе

Барысаўская профшкола будаўнікоў упускае сваю асноўную ўстаноўку—падрыхтоўку кваліфікаваных рабочых, а толькі гоніцца за прыбыткам. Заказы (сталы, лаўкі, табурэткі, шафкі і г. д.). бяруцца адны і тыя-ж. На школьных радах можна чуць толькі аб тым: як павысіць заробак інструктара, аб прызначэньні загадчыка па якой-небудзь галіне, прызначыць бібліотэкара і г. д., а пытаньні аб пастаноўцы навучаньня ніколі і не стаялі.

На трэцім курсе з набраных 45 чалавек засталося к выпуску 15, на другім курсе з 43 засталося—18, такое-ж становішча пагражае і першаму курсу. Програмы ў школе няма, таму што Наркамасьветы для прошколы будаўнікоў праграмы ня выпрацаваў так адказва заг. школай. Неабходна адзначыць тое, што нашы гаспадарнікі вельмі дэнна адносяцца да профшкольцаў. Замест таго, каб паслаць профшкольцаў у час летніх вакацый на прадпрыемства, іх паслалі ў вёску касіць сена. Такое становішча ў Барысаўскай профшколе будаўнікоў існуе на працягу некалькіх гадоў.

С.

Сталоўка ці карчма?

Існуе ў Старых-Дарогах сталоўка, але яна падобна больш да карчмы, чым да сталоўкі. Калі ня зойдзеш у яе—бруду па вушы, няма на чым сесьці, сядзяць на дзьверах, якія абарваны з вушакоў, сталы не пакрыты цыратай, а калі дзе і пакрыты, дык абадранай. Наогул сталоўка ня мае выгляду савецкай сталоўкі. Абеды бываюць часьцяком нядобраякасныя; то мяса сырое, хоць нагаю прытаптчы, каб адкусіць катлеты недажараныя. Малако пападаецца негатаванае, у ім плаваюць вялікія кавалкі ільду; у гарбату замест цукру пападае соль. Буфэтчыца Жэліхоўская, бышая сіоністка, адносіцца да наведвальнікаў вельмі груба. Ня шкодзіла-б праўленьню спажывецкага таварыства паклапаціцца аб паляпшэньні харчаваньня і лепшых адносінах працаўнікоў да наведвальнікаў.

Абрамовіч Л.

ДА УСЕБЕЛАРУСКАГА ПОЛІТБОЮ

Фрунзэўка, рыхтуйся

Фрунзэўскі РК ЛКСМБ у выкананьне пастановы ЦК ЛКСМБ аб усебеларускім палітбоі, як аднаго з мерапрыемстваў правядзеньня 3 месячніка беларускай і нацменаўскай пролетарскай культуры лічыць, што яшчэ ня ўсе ячэйкі і калектывы ЛКСМБ па баявому ўзяліся за правядзеньне ў жыцьцё гэтага важнага палітычнага мерапрыемства (Эльвод, Менбудтрэст, зав. ДА).

Гэты палітбой супадае разам з вялікім сьвятам комсамолу і ўсяе рабочае клясы з першай гадавінай соцыялістычнага спаборніцтва. Ленінскі комсамол, які зьяўляўся застрэльшчыкам соцспаборніцтва пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі ператварыў соцспаборніцтва ў агульна-рабочае. Ствараюцца ўдарныя цэхі, заводы вытворча-бытавыя комуны, як вышэйшая форма комуністычнай працы. Сродкамі абароны нашай організацыі будзе лічыцца ня толькі тэорытычная падрыхтоўка, але і тое, як удзельнічала ўся організацыя, кожны комсамолец у соцыялістычным спаборніцтве, ва ўдарных брыгадах, вытворчых комунах.

Лік і якасьць працы ўдарных брыгад, выкананьне прамфінпляну—будуць лепшымі сродкамі абароны нашай арганізацыі. Гэтыя сродкі не павінны быць скарыстаны, як часовымі мерапрыемствамі к палітбою, а гэтыя дасягненьні павінны быць замацаваны і разьвіты надалей.

У II палове красавіка наша організацыя з уцягненьнем беспартыйных і дарослых рабочых павінна выйсьці на бой з Кастрычніцкім раёнам. Добрыя вынікі і перамога ў палітбаі будзе залежыць ад поўнай баявой гатоўнасьці палітбайцоў, кіраўнікоў політгурткоў і ўсёй організацыі Фрунзэнскага раёну.

Асноўнае пытаньне парадка дня палітбоя:

Поўнае разуменьне нацыянальнай політыкі партыі, карэньняў нацыянал-дэмократызму, шовінізмаў розных колераў, вядучы рашучую барацьбу з іх праявамі на практыцы.

Пяцігодка гаспадарчага культурнага будаўніцтва БССР.

Добрая прапрацоўка апошніх пастаноў партыі па колектывізацыі сельскай гаспадаркі, і на базе масавай колектывізацыі ліквідацыі кулацтва як клясы, статут с-г. арцелі правядзеньне веснавой сяўбы і іншае.

Выставіць у якасьці абароны ад кожнай ячэйкі пэўную колькасьць ударных брыгад, вытворча-бытавых комун, выкананьне прамфінпляну, вынікі соцыялістычнага спаборніцтва (у выглядзе дыяграм, рапартоў і іншае), колькасьць сабраных сродкаў на падводную лодку, трактарную калёну, пазыка індустрыялізацыі, збор падпіскі на творы Леніна з лепшымі паказчыкамі правядзеньня 3-х месячніку і іншае.

Ячэйкам ЛКСМБ неабходна заразжа заняцца пытаньнем падрыхтоўкі палітбою, арганізоўваючы для гэтай мэты спэцыяльныя гурткі, групы, прапрацоўка на сходах ячэяк.

Неабходна распачаць праверку і падвесьці вынікі ўдзелу комсамолу ў соцыялістычным спаборніцтве. Праверка шэрагаў ударнікаў работы ўдарных брыгад вытворча бытавых комун, каб кожная ячэйка мела пэўныя лічбы ўдзелу сваіх комсамольцаў.

Вынікі ўдзелу ў соц. спаборніцтве прадставіць у РК ЛКСМБ не пазьней 15-IV—30 г. Разам з гаспадарнікамі падагуліць выкананьне II-га кварталу, з другога году пяцігодкі, работы па рацыяналізацыі і вынаходству і іншае.

Неабходна адзначыць, яшчэ і тое, што перамога таксама залежыць ад добрай пастаноўкі рэвалюцыйнай дысцыпліны ў шэрагах політбайцоў, што зачастую на гэты бок ня ўсе ячэйкі зьвяртаюць дастаткова ўвагі.

Спадзяемся, што пры належнай увазе комсамольскіх ячэяк і добрага разуменьня сутнасьці і значэньня політбою мы з посьпехам правядзем політбой.

Увага!

Пры прапрацоўцы пытаньняў нацыянал-дэмократызму і шовінізмаў усіх колераў у сувязі з падрыхтоўкай да ўсебеларускага політбою, ЦК ЛКСМБ раіць кіраўнікам гурткоў і ўсім ячэйкам кіравацца падручнікамі выданьня АПАД ЦК КП(б)Б „У дапамогу пропагандыстаму і агітатару“ вып. другі. Кошт нумару 30 кап. У гэтым нумары паказаны неабходны матар'ял і літаратура, якая патрэбна для прапрацоўкі памянёных пытаньняў. Кніжка маецца ва ўсіх кнігарнях.

Акрамя таго, у хуткім часе выйдзе з друку сэрыя брошур „Да усебеларускага політбою“. Выданьне ЦК ЛКСМБ, па якіх дадаткова патрэбна будзе прапрацоўваць асноўныя пытаньні.

Кадры—колгасам

6-ты стралковы полк організаваў з чырвонаармейцаў, дэмобілізуючыхся ў гэтым годзе, курсы па падрыхтоўцы колгасных працаўнікоў і організатараў розных галін працы, загадчкаў колгасу, жывёлаводаў, насеньнікаў, трактарыстых і гідратэхнікаў, якія пасьля дэмобілізацыі з Чырвонай арміі пойдуць на практычную працу ў колгасы.

Ваенкор Курапаценка.

Паведамленьні

Ячэйка ЛКСМБ БДВ і рэдакцыя газэт організоўвае дыспут па фэльетону „В тупике“, які быў зьмешчаны ў „Комсамольской Правде“. Дыспут адбудзецца 31 сакавіка, у Доме Пісьменьнікаў, а 7 гадзіне ўвечары. Запрашаюцца комсамольскія ячэйкі друкароў, працасьветы, абутковай фабрыкі і інш. вытворчыя ячэйкі.

Сёньня, а 6 гадзіне ўвечары, у памяшканьні АК КП(б)Б. (3-ці паверх, заля паседжаньняў) нарада сэкратароў ячэек ЛКСМБ г. Менску.

ЦК ЛКСМБ папярэджвае ўсіх комсамольцаў, што на трактарбуд без камандыровак ЦК ЛКСМБ і праходжаньня адборачнай камісіі пры АК ЛКСМБ па дадзенай разьвёрстцы ніхто прымацца ня будзе.

Прапануецца ячэйкам, РК і АК ЛКСМБ ня здымаць з вучоту ўсіх тых комсамольцаў, якія жадаюць ехаць самавольна.

ЦК ЛКСМБ.

Адказны рэдактар
Рэдколегія

Менск, друкарня БДВ.

Галоўлітбел № 599